МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

21 снежня 2018 г. № 51 (484)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

ПРАПАНУЕМ ПАДПІСАЦЦА

УВАГА!

на пятнічны нумар газеты «Звязда» з дадаткам «Мясцовае самакіраванне» (выходзіць штотыднёва).

Для юрыдычных асоб – 63307

Для фізічных асоб – 633072

Аформіць падпіску можна на тэрмін ад аднаго месяца да паўгода.

ЗАНЯТАСЦЬ

У БЕСПРАЦОЎЯ — МУЖЧЫНСКІ ТВАР

На канец лістапада доля жанчын сярод беспрацоўных склала 37,5 %. Сёння па дапамогу ў цэнтры занятасці больш звяртаюцца мужчыны



Фота носіць ілюстрацыйны характар.

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

— З 2016 года дзейнічае дзяржаўная праграма па сацыяльнай абароне і занятасці насельніцтва, прынятая на пяць гадоў, — адзначыў **начальнік упраўлення палітыкі занятасці Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Алег ТОКУН.** — У ёй прадугледжаны праграмы, скіраваныя на забеспячэнне занятасці жанчын. Сярод іх — прафарыентацыйныя мерапрыемствы і прафесійнае навучанне.

Службы занятасці навучаюць жанчын больш як па ста прафесіях, з іх 20 % — інтэграваныя (засвойванне дзвюх-трох спецыяльнасцяў адначасова). Жанчыны, якія даглядаюць дзіця ва ўзросце да трох гадоў, маюць такое ж права на адукацыю, як і беспрацоўныя. З іх ужо больш за 80 атрымалі новую спецыяльнасць.

Самазанятасць стымулююць шляхам выдзялення субсідый. За дзевяць месяцаў іх атрымала 561 жанчына: 461 арганізавала ІП, 97 займаюцца рамесніцкай дзейнасцю, тры — занятыя ў сферы аграгурызму. 366 жанчын прайшлі папярэдняе навучанне асновам прадпрымальніцкай дзейнасці.

Акрамя міністэрства, занятасцю жанчын займаецца і ПРААН. Аднак не мэтанакіравана, а ў межах агульных праектаў: галоўная задача арганізацыі — забеспячэнне гендарнай роўнасці.

— Пры падтрымцы пасольства Вялікабрытаніі мы пачалі даследчую ініцыятыву, якая скіравана на вывучэнне новых падыходаў у павышэнні жаночай занятасці і развіцці жаночага прадпрымальніцтва, — расказаў **каардынатар праектаў ПРААН у Беларусі Кірыл СЦЕЖКІН.** — На аснове даследаванняў брытанскай кампаніі, якая займаецца аналізам паводзін, вынаходзім дробныя праблемы, стэрэатыпы, якія перашкаджаюць у прафесіі. Так, па іх даных, жанчыны радзей займаюцца бізнесам, таму што менш схільныя рызыкаваць. Ім складаней уладкавацца на работу, бо пры праглядзе вакансій хочуць дакладна адпавядаць усім патрабаванням наймальніка.

Існуе і праблема, калі пры роўных умовах у мужчын больш шанцаў атрымаць крэдыт, чым у жанчын. А таксама ўсё яшчэ захоўваецца разрыў у заработнай плаце паміж імі. Гэтымі пытаннямі праз аналіз паводзін і збіраецца заняцца арганізацыя ў найбліжэйшыя гады.

У сферы занятасці і самазанятасці ў малых гарадах пачаў ажыццяўляцца сумесны праект ПРААН з Міністэрствам эканомікі пры падтрымцы Расіі. У яго рамках вядзецца работа з прадпрымальніцкімі ініцыятывамі ў Магілёўскай і Віцебскай абласцях. Адметна, што нядаўна ПРААН і Міністэрства эканомікі падпісалі праектны дакумент «Падтрымка эканамічнага развіцця на мясцовым узроўні ў Рэспубліцы Беларусь». Ён фінансуецца Еўрапейскім саюзам і Праграмай развіцця ААН, бюджэт складае каля 10 мільёнаў долараў. Адной з задач дадзенага праекта з'яўляецца стымуляванне жанчын займацца прадпрымальніцкай дзейнасцю.

Юлія АДАМОВІЧ.

СЁННЯ Ў НУМАРЫ

Беларусь запрашае!

Замежнікам могуць дазволіць прыляцець па бязвізе праз аэрапорты Брэста і Гродна. стар. 3

Свята ў кожную хату!

Стартавала рэспубліканская акцыя «Нашы дзеці». стар. 3

Маленькія зоркі ў «Космасе»

У вёсцы Копішча Бараўлянскага сельсавета адкрыўся новы дзіцячы сад. стар. 3

Ноўтбук за макулатуру



1000 тон паперы, якую можна перапрацаваць, сабралі беларускія школьнікі за два месяцы. стар. 16

ПАРТНЁР ТЭМЫ ТЫДНЯ: